КРЫМІНАЛЬНЫЯ СПРАВЫ АДНОСНА СЛУЖБОВЫХ АСОБ БЕЛАРУСКАЙ КАЛІЙНАЙ КАМПАНІІ

Следчы камітэт расследуе крымінальныя справы адносна службовых асоб ЗАТ «Беларуская калійная кампанія», паведамілі БЕЛТА ў аддзеле інфармацыі і сувязі з грамадскасцю СК Беларусі.

«Следчым камітэтам Рэспублікі Беларусь расследуюцца крымінальныя справы, заведзеныя Генеральнай пракуратурай па ч.3 арт.424 «Злоўжыванне ўладай і службовымі паўнамоцтвамі» КК у адносінах да службовых асоб ЗАТ «Беларуская калійная кампанія» (ЗАТ «БКК»): старшыні наглядальнага савета Уладзіслава Баумгертнера, члена наглядальнага савета Алега Пятрова, першага намесніка генеральнага дырэктара Канстанціна Саладоўнікава, намесніка генеральнага дырэктара па фінансах Ігара Яўстратава, начальніка фрахтовага аддзела Дзмітрыя Самойлава і іншых асоб», — растлумачылі ў камітэце.

У СК дадалі, што падставай для распачынання крымінальных спраў паслужылі матэрыялы аб учыненні гэтымі людзьмі відавочных злоўжыванняў службовымі паўнамоцтвамі ў карыслівых мэтах, што прывяло да нанясення істотнага ўрону дзяржаўным і грамадскім інтарэсам Рэспублікі Беларусь, а таксама нанясення ўрону ў асабліва буйным памеры ААТ «Беларуськалій» і ЗАТ «БКК». «На падставе наяўных доказаў і іншых фактычных матэрыялаў Следчым камітэтам вынесены пастановы аб прызнанні названых асоб абвінавачанымі», — таксама паведамілі ў ведамстве.

Старшыня наглядальнага савета ЗАТ «БКК» Уладзіслаў Баумгертнер затрыманы, у адносінах да яго выбрана мера стрымання ў выглядзе ўзяцця пад варту. Пятроў, Саладоўнікаў, Яўстратаў, Самойлаў аб'яўлены ў вышук, у тым ліку па лініі Інтэрпала. У ходзе расследавання крымінальных спраў Следчым камітэтам устанаўліваюцца і дакументуюцца іншыя факты супрацьпраўнай дзейнасці вышэйназваных і іншых службовых асоб ЗАТ «БКК».

ДЗЯРЖАВА І БІЗНЕС РАЗАМ ШУКАЮЦЬ ВЫЙСЦЕ

Напрыканцы мінулага тыдня ў Дзяржынску адбылося чарговае пасяджэнне Савета па развіцці прадпрымальніцтва ў Беларусі. Спачатку спакойная атмасфера звычайнага дакладна-справаздачнага мерапрыемства пасля змянілася эмацыянальным абмеркаваннем праблем, якія перашкаджаюць развівацца беларускаму бізнесу. Высокія стаўкі падаткаў, дарагая арэнда, недаступныя фінансы, слабая канкурэнцыя, нежаданне стварэння новых вытворчасцяў, катастрафічны недахоп кваліфікаваных работнікаў — пра гэта і шмат што іншае ішла размова.

Работнікаў шмат, а прафесіяналаў няма

Аляксандр ШАКУЦІН, старшыня савета дырэктараў ААТ «Амкадор», паказаў удзельнікам пасяджэння зусім нядаўна створанае прадпрыемства «ПМІ «Гідраўліка», а пасля расказаў пра свае поспехі і даў некалькі парад. Па-першае, «сёння вытворчасць — гэта, перш за ўсё, лагістыка. Нельга будаваць заводы па савецкіх прынцыпах. Нават зэканомленая доля секунды можа знізіць сабекошт прадукцыі». Па-другое, Аляксандр Шакуцін прызнаўся, што на пытанне, якая ў беларускай вытворчасці зараз самая вялікая праблема, адказаў бы: «Поўная адсутнасць кваліфікаваных кадраў. А значыць, мы сёння павінны адбіраць найбольш «галавастых», адпраўляць на Захад вучыцца. Пасля яны будуць прыязджаць і вучыць іншых». Ёсць і яшчэ адна страшная праблема: «беларуская вытворчасць утрымлівае да 40% лішніх людзей. Але пры гэтым у нас і дэфіцыт працоўных рэсурсаў». **Віцэ-прэм'ер Беларусі Пётр ПРАКАПОВІЧ,** які з'яўляецца старшынёй Рады, пасля пацвердзіў, што «колькасць людзей насамрэч большая, чым патрэбна. Пасля аптымізацыі шмат работнікаў становяцца вольнымі. Напрыклад, толькі за першае паўгоддзе ў Міністэрстве прамысловасці вызвалілася больш за 10 тысяч чалавек. Але калі на малых прыватных прадпрыемствах будуць ствараць новыя працоўныя месцы, то гэты працэс будзе ісці бясшкодна». «Мы прайшліся з вамі па вытворчасці і ўбачылі сучасную тэхніку, дзе ўсё аўтаматызавана. Тут патрэбна мінімальная колькасць людзей, але гэта павінны быць спецыялісты высокай кваліфікацыі, — заявіў Пётр Пракаповіч. — Толькі высокай прадукцыйнасцю працы мы можам вырашыць дзве асноўныя нашы праблемы — павышэнне жыццёвага ўзроўню насельніцтва і павышэнне канкурэнтаздольнасці нашых тавараў і паслуг, каб мы маглі годна выйграваць канкурэнтную барацьбу на любых рынках. Без месца на рынку сёння не можа быць ніякай перспектывы».

Дарэчы, пытанне адукацыі кваліфікаваных работнікаў вырашана больш падрабязна разгледзець на наступным пасяджэнні, прыкладна ў кастрычніку.

Экспарт і толькі экспарт

Так каротка можна перадаць словы намесніка прэм'ер-міністра Беларусі аб эканоміцы Беларусі. «Наша краіна арыентавана толькі на экспарт. Мы ўжо сёння павінны 65% усёй прадукцыі прадаваць за мяжу, а заўтра — 85%. Наша эканоміка пабудавана так, што мы вымушаны імпартаваць сыравіну і матэрыялы, а значыць, шмат павінны і адпраўляць на экспарт. Таму ўсё, што мы імпартуем, потым павінна прадавацца ў экспартнай прадукцыі. І тут вялікую ролю павінен сыграць прыватны бізнес. Ён павінен быць піянерам. У вас магчымасцяў больш, чым у іншых, каб укараняць сучасныя тэхналогіі, выкарыстоўваць новыя метады кіравання, — звярнуўся да прадпрымальнікаў Пётр Пракаповіч, — вы ведаеце, як працаваць у рынкавых умовах, таму важна, каб гэты вопыт быў выкарыстаны».

Ад бізнесу — 50% ВУП

Віцэ-прэм'ер паставіў і такую задачу: «Усё, што ёсць у свеце лепшага ў плане тэхналогій, павінна быць у нас. Калі 10-15 гадоў таму доля прыватных прадпрыемстваў была нязначнай, то сёлета мы павінны выйсці на чвэрць ВУП ад прадпрыемстваў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. І гэтая лічба будзе толькі павялічвацца. Да 2015 года — не менш за 30%. А ў наступнай пяцігодцы прыватны бізнес павінен ствараць 50% ВУП».

Асабліва важнае развіццё малога бізнесу ў рэгіёнах. «У некаторых раённых цэнтрах рэспублікі паступленні ў бюджэт падаткаў ад прыватнага бізнесу дасягае 60%. Нягледзячы на жорсткую канкурэнцыю, колькасць прадпрыемстваў малога і сярэдняга бізнесу з кожным годам расце (па 10-20% за год). Значыць, яны бачаць перспектывы і маюць умовы для развіцця. Але мы павінны разабрацца, якія праблемы перашкаджаюць ім працаваць лепш».

ПДВ не падымуць?

Пётр Пракаповіч падтрымлівае прапанову бізнесу не павышаць стаўку ПДВ: «Будзем уносіць адпаведную прапанову ва ўрад». Сёння стаўка падатку на дабаўленую вартасць складае 20%. Аднак намеснік кіраўніка ўрада кажа, што «рэвалюцыйны шлях у падатковай палітыцы непрымальны, у эканоміцы павінна быць стабільнасць. Мы не можам пайсці на тое, каб рэзка знізіць падаткі». У той жа час, па яго словах, стаўка падатку на прыбытак вызначана канкурэнтная — 18%, а значыць, прадпрымальнікі маюць магчымасць накіроўваць свой прыбытак на развіццё. Але **Сяргей Навіцкі, генеральны дырэктар прадпрыемства «Хенкель Баўтэхнік», член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,** намеснік старшыні Савета па развіцці прадпрымальніцтва, паведаміў наступнае: «Цікавая сітуацыя з падатковай нагрузкай у краінах Мытнага саюза. Па свежых звестках Сусветнага банка, падатковая нагрузка ў Казахстане складае 26,8% ад прыбытку арганізацый, у Расіі — 54,1%, у Беларусі — 60,7%. Пры адсутнасці мытных бар'ераў паміж нашымі краінамі падаткі з'яўляюцца практычна адзіным рэгулятарам эканамічнай дзейнасці. У сувязі з гэтым мяне непакоіць той факт, што Міністэрства фінансаў збіраецца павялічыць стаўку падатку на дабаўленую вартасць да 22% нават пры тым, што адначасова будзе зніжацца стаўка падатку на прыбытак. Гэта, на маю думку, зніжае канкурэнтаздольнасць айчынных вытворцаў».

Хочаш памяшканне ва ўласнасць? Плаці

Шмат пытанняў ад прадстаўнікоў бізнес-саюзаў тычыліся набыцця арэндаваных плошчаў ва ўласнасць. Гэтая тэма разглядаецца ва ўрадзе, але праблем яшчэ шмат. «Мы ўзялі на кантроль усю маёмасць, якая здаецца ў арэнду і якая можа быць прададзена ва ўласнасць, але продаж яе павінен ісці па рынкавым кошце», — кажа Петр Пракаповіч. На думку намесніка прэм'ер-міністра, сёння высокія арэндныя стаўкі на памяшканні таму, што іх не хапае. «Значыць, трэба ўзводзіць новыя памяшканні — для гэтага перашкод няма». Па словах віцэ-прэм'ера, «у Мінску 300 фірмаў звярнуліся з заявамі купіць арэндаваныя памяшканні, але калі яны даведаліся пра кошт, то ахвотнікаў засталося толькі 100. Тым не менш попыт на выкуп арэндаванага памяшкання ва ўласнасць ёсць». Трошкі іншай думкі прытрымліваецца Аляксандр Шакуцін: «Аддайце вы непрацуючае прадпрыемства прыватніку хоць за адну базавую велічыню, толькі абавяжыце там працаваць, — і вы атрымаеце грошы праз падаткі. Паўсюль павінен быць гаспадар. Трэба развіваць вытворчасць, а не гандаль. Паглядзіце, колькі ўжо ў нас гандлёвых цэнтраў! І там прадаецца імпартная прадукцыя. А трэба выпрацоўваць сваё». У сваю чаргу Аляксандр Турчын, намеснік старшыні Мінскага абласнога выканаўчага камітэта, паскардзіўся на тое, што ўсе, хто да яго прыходзіць, хочуць памяшканні выключна за МКАДам. «Ды бярыце вы ў іншых месцах памяшканні — калі ласка. Мы гатовы сёння ісці насустрач і паніжаць цану, даваць растэрміноўку».

Замест гандлю — вытворчасць

Па-ранейшаму непакоіць прадпрымальнікаў і пытанне паставак прадукцыі ў рэспубліку ў адпаведнасці з тэхнічнымі рэгламентамі Мытнага саюза. Пётр Пракаповіч лічыць, што ў прадпрымальнікаў не павінна быць праблем з пастаўкай сертыфікаванай ці дэкларыраванай прадукцыі. «Прадпрымальнікі павінны разумець, што сёння сітуацыя не тая, што 20 гадоў таму, цяпер дзейнічаюць буйныя гандлёвыя сеткі і ўжо не па кожны тавар чалавек ідзе на рынак. Калісьці гэта ўсё скончыцца. Тыя, хто гандлюе на рынку, павінны гэта разумець і падумаць, чым яны будуць займацца далей — вытворчасцю ці імпартам тавараў», — падкрэсліў віцэ-прэм'ер.

Працаваць павінны і дзяржава, і прыватнік

Віктар МАРГЕЛАЎ, старшыня саюза юрыдычных асоб «Рэспубліканская канфедэрацыя прадпрымальніцтва», лічыць, што стрымальным фактарам для развіцця эканомікі з'яўляюцца пастаянныя дэвальвацыйныя чаканні, адсутнасць канкурэнцыі і зніжэння выдаткаў. Таксама яго непакоіць пытанне, чаму людзі, якія атрымліваюць па два-тры мільёны, не хочуць пераходзіць на больш напружаную працу з заробкам у шэсць-сем мільёнаў? Можа быць, трэба штосьці змяняць у сацыяльнай сістэме і падумаць і пра духоўнае развіццё грамадства? Але галоўным пасылам прадстаўніка бізнесу была просьба: «Хопіць размяжоўваць на дзяржаўнае і прыватнае — усе павінны працаваць». Аляксандр Калінін, старшыня грамадскага аб'яднання «Беларускі саюз прадпрымальнікаў», дадаў да праблемных пытанняў высокі кошт фінансавых рэсурсаў.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.

г. Дзяржынск.

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

РОК АД «БЕЛАЙ РУСІ»

На галоўнай плошчы Наваполацка — плошчы Будаўнікоў — 30 жніўня пройдзе рок-фестываль (у рамках акцыі «Музычныя вечары «Белай Русі»).

Больш за 20 маладых і ўжо вядомых калектываў з Полацка і Наваполацка, а таксама іншых рэгіёнаў Беларусі стануць удзельнікамі гэтага вялікага фэсту, які праводзіцца ўжо ў трэці раз. Мерапрыемства праходзіць пад эгідай Наваполацкай гарадской арганізацыі рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» па асабістай ініцыятыве яе старшыні, дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Вадзіма Дзевятоўскага, вядомага спартсмена, прызёра Алімпіяды.

— Гэтым канцэртам мы хочам падтрымаць таленавітых музыкаў. Магчыма, менавіта ўдзел у нашым фестывалі стане для іх стымулам для пачатку паспяховай музычнай кар'еры і творчага росту. Прыемна адзначыць, што колькасць ахвотных выступіць на галоўнай плошчы Наваполацка з кожным годам расце: сёлета паступіла каля 30 заявак, а значыць, наша музычная рок-падзея мае пазітыўны імідж і запатрабаванасць, — сказаў Вадзім Дзевятоўскі.

Інфармацыйная падтрымка мерапрыемства — тэлекампанія «БелМузТБ», а генеральны спонсар — пітная вада «Баравая».

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЦЫГАРЭТЫ ЗНОЎ ПАДАРАЖЭЛІ

У верасні максімальныя рознічныя цэны на асобныя віды цыгарэт з фільтрам павялічацца на 1,9-4,3 працэнта. Гэтая інфармацыя размешчана на сайце Міністэрства па падатках і зборах.

Так, максімальныя рознічныя цэны на цыгарэты вытворчасці ТАА «Тытунь-інвест» «Карона эліт» павялічацца на 1,9 працэнта (да 5,4 тысячы рублёў за пачак), «Карона» і «Карона блакітная» — на 3,3 працэнта (да 6,2 тысячы рублёў), «Карона слім» — на 3,6 працэнта (да 5,7 тысячы рублёў), «Форт» і «Форт-7» — на 3,8 працэнта (да 5,5 тысячы рублёў за пачак). Кошт цыгарэт «Winston XSence Blue» і «Winston XSence Silver» павялічыцца на 4,3 працэнта (да 12 тысяч рублёў).

Вызначаны цэны на тытунёвыя вырабы, якія раней не прадаваліся ў краіне. Так, цыгарэты «Sobranie Black», «Sobranie Blue» і «Sobranie Gold» будуць каштаваць на ўзроўні 20 тысяч рублёў, «Came Filters», «Camel Blue», «Camel Silver» — 11,8 тысячы рублёў.

Апошні раз цэны на асобныя віды тытунёвых вырабаў павялічваліся ў пачатку жніўня. Тады рост склаў ад 5 да 21,2 працэнта.

У ГОРАДЗЕ ГАРЭЎ ГАНДЛЁВЫ ЦЭНТР...

Буйны пажар у новабудоўлі гандлёвага цэнтра адбыўся ў Смалявічах. Пры самаратаванні пацярпеў адзін чалавек. У тушэнні былі задзейнічаны 24 адзінкі тэхнікі і 45 пажарных-выратавальнікаў. На месца выязджала аператыўная група Міністэрства па надзвычайных сітуацыях на чале з намеснікам міністра.

— Пра загаранне новабудоўлі па вуліцы Гандлёвай у 15.20 у цэнтр аператыўнага ўпраўлення Смалявіцкага падраздзялення МНС паведаміў вартаўнік. Гарэў аднапавярховы, каркаснага тыпу будынак вытворча-лагістычнага цэнтра «Алмі» памерамі 60х80х6 метраў. На момант загарання ў ім праводзіліся будаўніча-мантажныя работы. Усяго на тэрыторыі аб'екта будоўлі знаходзілася каля 50 чалавек падраднай і субпадрадных арганізацый. Праводзіліся агнявыя работы па рэзцы металу, з-за чаго ў 15.10 і адбылося ўзгаранне ўцяпляльніка з наступным распаўсюджваннем агню па перыметры будынка, — расказалі ў Мінскім абласным упраўленні МНС. — Да прыбыцця падраздзяленняў МНС работнікі прадпрыемства спрабавалі самастойна ліквідаваць загаранне пры дапамозе пяці вогнетушыцеляў. У выніку хуткага распаўсюджвання агню па гаручым матэрыяле і стварэння высокай тэмпературы выбухнулі два кіслародныя балоны, што знаходзіліся ўнутры будынка. Пры самавыратаванні пацярпеў зваршчык, які скокнуў з даху з вышыні шасці метраў. Ён атрымаў адкрытую чэрапна-мазгавую траўму.

У гэты ж дзень увечары адбыўся яшчэ адзін пажар у Смалявіцкім раёне: паблізу вёскі Чэрнікаўшчына загарэўся склад. Пра тое ў 21.20 паведаміў пажарным мужчына, што праязджаў міма. Склад знаходзіўся на адлегласці 1,5 кіламетра ад вёскі. У выніку пажару згарэла 30 тон саломы пад навесам. Работнікі МНС папярэдзілі знішчэнне агнём 235 тон угнаенняў, што знаходзіліся ўнутры склада.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ЗНІЗІЎСЯ АБ'ЁМ ПРАМЫСЛОВАЙ ПРАДУКЦЫІ

Сёлета ў студзені—ліпені агульны аб'ём прамысловай вытворчасці ў краіне склаў 35,26 мільярда рублёў, знізіўшыся ў параўнанні з леташнім перыядам на 4,5%, паведамілі ў статыстычным ведамстве краіны.

Як сведчыць статыстыка, аб'ём вытворчасці ў прамысловасці за сем месяцаў гэтага года ў параўнанні з такім жа перыядам леташняга знізіўся амаль на 5%. У тым ліку харчовых прадуктаў, уключаючы напоі, і тытуню сёлета ў студзені—ліпені было выпушчана на 2,8% больш, чым за першыя сем месяцаў мінулага года, хаця ў ліпені гэтага года аб'ём вытворчасці знізіўся на 5% у параўнанні з леташнім ліпенем.

Паводле статыстыкі, сёлета ў параўнанні з першым паўгоддзем мінулага года доля стратных прадпрыемстваў у сельскай гаспадарцы, паляванні і лясной гаспадарцы ўзрасла на 1,3% — таму што расла не доля, а скарачалася іх колькасць.

У сельскай гаспадарцы ў першым паўгоддзі гэтага года ў параўнанні з такім жа перыядам мінулага доля стратных прадпрыемстваў павялічылася на 2,5%, хаця ў параўнанні з сёлетнім першым кварталам за справаздачны перыяд гэты паказчык знізіўся толькі на 0,5 працэнтнага пункта. Затое паказчык стратнасці сельгаспрадпрыемстваў Беларусі па-ранейшаму застаецца адным з самых нізкіх сярод усіх айчынных галін. Нейкія пагаршэнні назіраюцца і ў гандлі тытунёвымі вырабамі. Але вось за гэтае пагаршэнне наш гандаль мы вітаем — і няхай атруты ў нас будзе як мага менш.

Пятро РАМАНЧУК.

А РАСЛІНАВОДСТВА АДСТАЕ...

За сем месяцаў сёлета ў гаспадарках усіх катэгорый вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў бягучых цэнах склала 45 трлн рублёў і зменшылася, у параўнанні з адпаведным перыядам летась, на 4,1%, паведамілі ў Нацыянальным статыстычным камітэце.

У сельскагаспадарчых арганізацыях аб'ём вытворчасці прадукцыі за гэты перыяд зменшыўся на 4,5%. Пры гэтым вытворчасць прадукцыі жывёлагадоўлі павялічылася на 1,9%, а вось у раслінаводстве — зменшылася на 17,8%. Зніжэнне аб'ёмаў прадукцыі раслінаводства абумоўлена, перш за ўсё, больш познімі тэрмінамі ўборкі ўраджаю збожжа сёлета ў параўнанні з мінулагоднім сезонам.

У студзені—ліпені сёлета гаспадаркамі ўсіх катэгорый краіны рэалізавана жывёлы і птушкі на забой (у жывой вазе) 969,4 тысячы тон, што на 10,2% больш, чым за такі перыяд летась, выраблена малака — 4 008,3 тысячы тон (на 2,1% менш), яек атрымана — 2 421,4 млн штук (на 3% больш). Сельскагаспадарчымі арганізацыямі за сем месяцаў рэалізавана жывёлы і птушкі на забой (у жывой вазе) 865,8 тысячы тон, што на 10,4% больш, чым у студзені—ліпені летась, яек выраблена — 1 598,3 млн штук, што на 4,7% больш.

Сяргей КУРКАЧ.

У СВЕТЛАГОРСКУ ДВА МЕСЯЦЫ ШУКАЮЦЬ УДАВА, ЯКІ ЎЦЁК

Пошукі ўдава, які ўцёк у Светлагорску, пакуль не далі выніку, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.

Каля двух месяцаў назад у адной з жыхарак райцэнтра ўцёк удаў. Уладальніца вынесла выгуляць рэптылію позна вечарам на дзіцячую пляцоўку. Аднак не заўважыла, як гадаванец даўжынёю каля метра знік у траве. З заявай аб прапажы змяі звярнуліся суседзі.

У райвыканкаме па гэтым пытанні праведзена пасяджэнне камісіі, на якой пошукам удава даручана займацца шэрагу службаў, у тым ліку прадпрыемству жыллёва-камунальнай гаспадаркі і праваахоўным органам. Апошняя адпрацоўка жылых масіваў, прылеглых да месца знікнення рэптыліі, вынікаў пакуль не дала.

■ Беларусь і свет

НАШЫ ПЕРСПЕКТЫВЫ НА РЫНКУ ПАЎДНЁВА-УСХОДНЯЙ АЗІІ

Сёлета спаўняецца два гады з таго моманту, як беларускі парламент атрымаў статус назіральніка ў Міжпарламенцкай асамблеі АСЕАН (Асацыяцыя краін Паўднёва-Усходняй Азіі). У верасні дэлегацыя з Беларусі, якую ўзначаліць намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Віталь БУСЬКА, паедзе на чарговае пасяджэнне Генасамблеі гэтай міжпарламенцкай арганізацыі. Яно пройдзе ў дзяржаве пад назвай Бруней-Дарусалам. На першы погляд, калі ўлічваць толькі геаграфічны фактар, гэты рэгіён не павінен асабліва цікавіць Беларусь. Аднак нават павярхоўны аналіз паказвае, што эканамічную выгаду можна атрымаць не толькі ў суседніх краінах, але і ў такіх аддаленых рэгіёнах, як Паўднёва-Усходняя Азія.

Па-першае, каб зразумець, чым Беларусі можа быць карысны гэты рэгіён, трэба хаця б аглядна зазірнуць у яго нядаўняе мінулае і ў час цяперашні. Ідэя стварэння арганізацыі АСЕАН зарадзілася яшчэ ў перыяд так званых Індакітайскіх войнаў. Гэта серыя ўзброеных канфліктаў у 50-70-х гадах мінулага стагоддзя, у тым ліку ўнутрыдзяржаўных, асноўнай арэнай для якіх былі тры краіны: В'етнам, Камбоджа і Лаос. Гэтая частка гісторыі нам добрая знаёмая як па дакументальных фільмах, так і па мастацкіх. Прычыны крывавых сутыкненняў тых гадоў звязаны, апроч іншага, з імкненнем Францыі і ЗША захаваць ці прымножыць свой уплыў у рэгіёне. Але ў выніку стала ясна, што каланіяльны перыяд заканчваецца і мясцовыя народы ўсё ж такі будуць жыць у незалежных дзяржавах.

У разгар гэтых канфліктаў, у 1967 годзе, у Бангкоку была падпісана дэкларацыя аб стварэнні АСЕАН. У канкрэтныя дамоўленасці яна перайшла толькі ў 1976 годзе, пасля падпісання іншых дакументаў на востраве Балі. Да таго моманту Лаос, Камбоджа і В'етнам яшчэ не ўвайшлі ў арганізацыю, але затое ў яе складзе апынуліся Інданезія, Малайзія, Сінгапур, Тайланд і Філіпіны, якія таксама, у прынцыпе, не так даўно былі калоніямі. Крыху пазней да іх далучыўся Бруней, які атрымаў незалежнасць, а ў 1990-х гадах і згаданая тройка, найбольш пацярпелая ад войнаў. Увайшла ў АСЕАН і М'янма. Такім чынам, цяпер у арганізацыі 10 краін. Агульнае насельніцтва гэтых дзяржаў — каля 600 млн чалавек, а агульны ВУП — больш за $2 трлн. Яны хочуць і могуць развівацца, а значыць, шукаюць гандлёвых партнёраў.

Віталь Бусько адзначыў, што для Беларусі цяпер асноўны партнёр у рэгіёне — В'етнам, які акрыяў пасля баявых канфліктаў. Ён, як вядома, суседнічае з Лаосам і Камбоджай. Перспектывы супрацоўніцтва з гэтымі краінамі даволі вялікія. Узяць хоць бы ваенна-тэхнічную сферу. Паводле справаздачы The Military Balance брытанскага Міжнароднага інстытута стратэгічных даследаванняў (IISS) за 2012 год, на ўзбраенні ў арміі Лаоса — савецкія танкі «Т-54» і «Т-55» і нават дзесяць «ветэранаў» «Т-34-85». Ёсць савецкія танкі і ў Камбоджы. Таксама гэтыя дзяржавы выкарыстоўваюць верталёты і самалёты з СССР, у тым ліку заказваюць іх новыя мадыфікацыі ў Расіі (транспартныя верталёты К-32Т). Калі казаць пра В'етнам, то, безумоўна, там нямала тэхнікі савецкай эпохі, у тым ліку комплексаў «С-125». Калі зірнуць на іншых членаў АСЕАН і іх суседзяў, то і там можна сустрэць узоры савецкага і постсавецкага ўзбраення. У прыватнасці, гэта самалёты «МіГ-29». Аднак нярэдка з імі суседнічае і прадукцыя ВПК Францыі, ЗША, іншых заходніх краін. Гэта датычыцца і авіяцыі, і наземных сродкаў СПА, і іншых відаў узбраення.

Пра што ўсё гэта сведчыць? Напэўна, пра тое, што Беларусь — гэта адна з краін, якая можа аказваць паслугі па мадэрнізацыі ваеннага парка краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Адзін з напрамкаў — мадэрнізацыя комплексаў «С-125» і пастаўка прыцэлаў для бранятэхнікі. Тэарэтычна наша краіна магла б супрацоўнічаць і з ВПС некаторых дзяржаў гэтага рэгіёна. Гаворка нават не пра мадэрнізацыю саміх самалётаў. Беларускія спецыялісты (часам у супрацоўніцтве з расійскімі) могуць ствараць трэнажоры для пілотаў «МіГ-29», «Су-25», «Мі-8» і гэтак далей.

Больш за тое, частка дзяржаў АСЕАН адчувае кадравы голад. У тым ліку патрабуюцца ваенныя спецыялісты ў галіне СПА. Калі ўлічыць, што Лаос, В'етнам і Камбоджа выкарыстоўваюць савецкае ўзбраенне, то Ваенная акадэмія Беларусі можа навучаць вайскоўцаў з гэтых краін. Тым больш што акадэмія была ўтворана на базе дзвюх ваенных ВНУ, адна з якіх — МВІЗРВ (Мінскае вышэйшае інжынернае зенітнае ракетнае вучылішча) СПА. Фактычна гэта была базавая ваенная ВНУ па падрыхтоўцы кадраў для савецкіх сіл супрацьпаветранай абароны.

Дэпутат Віталь Бусько адзначае, што не менш перспектыўны напрамак — гэта падрыхтоўка спецыялістаў для МНС. Асабліва актуальна гэта для тых краін АСЕАН, дзе сухі сезон змяняецца вялікімі паводкамі. А беларускія ратавальнікі назапасілі ўжо досыць нядрэнны вопыт па ліквідацыі наступстваў паводак.

Таксама В'етнам і іншыя краіны рэгіёна маюць патрэбу ў спецыялістах у галіне сельскай гаспадаркі. Ды ці мала яшчэ якім спецыяльнасцям могуць навучацца ў Беларусі жыхары гэтых краін. Тым больш што ў В'етнаме цэлае пакаленне, якое зараз займае многія важныя пасады ў дзяржапараце, праходзіла вучобу ў савецкіх, у прыватнасці, беларускіх, ВНУ. У гэтых людзей склалася досыць пазітыўная думка пра нашу сістэму адукацыі. Пакуль гэтае пакаленне яшчэ не пастарэла, беларускі бок мае ўсе магчымасці, каб аднавіць такое навучанне. І трэба сказаць, што ў гэтым плане ўжо шмат зроблена, грамадзяне некаторых краін АСЕАН праходзяць зараз навучанне ў Беларусі альбо нядаўна яго завяршылі.

Акрамя адукацыйнага аспекту, ёсць перспектывы супрацоўніцтва і ў навуковай сферы, але не ў тэарэтычнай плоскасці, а ў практычнай. Напрыклад, у камбаджыйскай зямлі засталося нямала мін, якія не заўсёды можна «ўбачыць» металашукальнікам, а карты мінных палёў ужо страчаны. Пошук гэтай ваеннай «спадчыны» можна весці з дапамогай спектральнага аналізу глебы, які мае на ўвазе наземныя замеры, а таксама выкарыстанне здымкаў з космасу. У гэтай частцы ў беларускага боку таксама ёсць свой вопыт.

Вышэй гаварылася пра ваенную тэхніку, але ў АСЕАН з яе краінамі, дзе дынамічна развіваюцца эканомікі, неабходны і сельгасмашыны, і грузавікі, і кар'ерныя самазвалы. Усё гэта выпрацоўваецца ў Беларусі. Няцяжка здагадацца, што на рынку ўжо прысутнічаюць і вытворцы з іншых краін. Напрыклад, у В'етнаме на адной пляцоўцы ёсць тры паралельныя лініі зборачных вытворчасцяў: «МАЗаў», кітайскіх і карэйскіх грузавікоў. Пры гэтым відавочна перавага беларускіх машын. Ды і наогул, канкурэнцыя не павінна палохаць нашых вытворцаў. Калі сядзець, склаўшы рукі, то гэтыя рынкі заваляць сваёй прадукцыяй заводы Кітая. Як вядома, яны вельмі часта бяруць коштам. Але не ўсіх задавальняе выключна танная тэхніка. Гэтым трэба карыстацца, займаць сваю нішу і ствараць зборачныя вытворчасці на ўсёй прасторы АСЕАН, што, дарэчы, ужо і пачата.

Пакуль гаворка ішла толькі пра наш экспарт, а які ўклад у павелічэнне тавараабароту могуць зрабіць краіны Паўднёва-Усходняй Азіі? У прыватнасці, адтуль наўпрост можна завозіць морапрадукты, якія Беларусь у любым выпадку заўсёды будзе імпартаваць. Калі правільна выбудаваць логіку і абысціся без пасярэднікаў, то цана на розныя дары мора ў беларускіх крамах можа знізіцца. Дэпутат Віталь Бусько звяртае ўвагу на тое, што зараз у В'етнам ходзіць досыць шмат судоў з беларускімі калійнымі ўгнаеннямі. Тэарэтычна яны маглі б ісці назад менавіта з морапрадуктамі. Ёсць перспектывы развіцця паставак і іншай прадукцыі з краін АСЕАН. Гэта ўжо асобная вялікая тэма. Нямала ў Паўднёва-Усходняй Азіі і радовішчаў карысных выкапняў, а гэта ўжо стратэгічныя інтарэсы. У Беларусі ёсць перспектывы паўдзельнічаць у распрацоўцы радовішчаў у В'етнаме. Але наўрад ці нашы кампаніі будуць вывозіць адтуль здабытыя выкапні. Хутчэй за ўсё, з'явіцца схема продажу іх у тым рэгіёне, а на атрыманую валюту можна закупляць карысныя выкапні ў нашых суседзяў.

Гаворачы пра Паўднёва-Усходнюю Азію, хацелася б яшчэ развеяць міф пра тое, што калі там ужо ваявалі, напрыклад ЗША, то могуць напасці і зноў. У прынцыпе, здарыцца можа ўсё, нават самае нечаканае. Аднак, па-першае, далёка не ўсе краіны АСЕАН удзельнічалі ў Індакітайскіх войнах. Некаторыя з іх наогул не мелі дачынення да гэтых канфліктаў, а супрацьстаянне Штатаў і Японіі было ў той частцы свету вельмі даўно — у 1940-х гадах, і свет з тых часоў значна змяніўся. Акрамя таго, амерыканцы і прадстаўнікі іншых заходніх дзяржаў укладваюць зараз грошы ў рэгіён. Напрыклад, у 2008 годзе В'етнам атрымаў $80 млрд чыстых інвестыцый. У краіне здаваліся пад ключ цэлыя прадпрыемствы. Зразумела, што інвестары, у тым ліку з ЗША, хочуць атрымаць аддачу, і амерыканскаму ўраду, мякка кажучы, не вельмі выгадна разгортваць там нейкія баявыя дзеянні. Тым больш што аб'ектыўна для гэтага цяпер няма ніякай падставы, ды і амерыканскае грамадства не вельмі ўхваляе апошнім часам усе гэтыя ваенныя авантуры.

Нашмат лагічней весці гаворку пра ўнутраныя пагрозы, бо часам падымаецца праблема па пераглядзе ліній дзяржмежаў як унутры АСЕАН, так і, напрыклад, паміж Кітаем і В'етнамам. Але занадта інтэнсіўна інтэгруюцца эканомікі азіяцкіх краін, і гэта, на шчасце, робіць войны нявыгаднымі. А калі казаць аб пазіцыі беларускага боку, то палітычнае кіраўніцтва ўжо не раз заяўляла, што наша краіна не будзе «сябраваць з кімсьці супраць кагосьці». Такая пазіцыя не можа не прываблівацьда сябе гандлёвых і палітычных партнёраў.

Яшчэ адзін напрамак магчымага супрацоўніцтва з краінамі АСЕАН — гэта турызм. У рэгіёне ёсць не толькі пройдзеныя турыстамі ўздоўж і ўпоперак Тайланд, але і В'етнам, які таксама мае вялікае ўзбярэжжа. Інфраструктура для адпачынку там яшчэ пачынае развівацца, але ўжо прыцягвае адпачывальнікаў з розных краін.

Але, як бы там ні было, усе гэтыя напрамкі магчымага супрацоўніцтва застануцца толькі пражэктамі, калі Беларусь не будзе развіваць адносіны па ўжо стандартнай для ўсяго свету схеме ўзаемных візітаў і ўваходжання ў рэгіянальныя арганізацыі. Абмен візітамі на вышэйшым і высокім узроўні ўжо пачаты. Статус назіральніка ў рэгіянальнай міжпарламенцкай арганізацыі атрыманы. Пры гэтым Віталь Бусько звярнуў увагу, што, акрамя Беларусі, назіральнікамі ў МПА АСЕАН з'яўляюцца такія краіны, як Расія, Канада і ЗША. Аналагічны статус атрымаў і Еўрапарламент. Апошні факт — асаблівая нагода задумацца для еўрацэнтрыстаў. Прычым, як адзначае Віталь Бусько, АСЕАН і яго парламенцкае вымярэнне нельга назваць арганізацыямі, у якія можна лёгка ўступіць ці атрымаць статус назіральніка. Гэта не прахадны пакой, а дастаткова сур'ёзны клуб краін, з якімі можна і трэба супрацоўнічаць. Кажучы простай мовай, Беларусі трэба спяшацца асвойваць рэгіён, каб добрыя пачынанні не зніклі дарма і краіна атрымала эканамічныя і палітычныя выгоды. Тым больш што, як адзначае беларускі парламентарый, многія краіны АСЕАН таксама з непрыхаванай цікавасцю глядзяць на нашу дзяржаву як на члена мытнай «тройкі». Гэта значыць, Беларусь можа стаць для іх партнёрам для выхаду на вялікі еўразійскі рынак.

Васіль МАЛАШЭНКАЎ, БЕЛТА ■

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога першага намесніка старшыні Дзяржкамвыда БССР ТКАЧУКА Рэма Андрэевіча і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю былога дырэктара гандлёвага рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Белсаюздрук» ШАБЛОЎСКАЙ Ларысы Кузьмінічны і выказвае глыбокае спачуванне яе родным і блізкім.